*Ірына Мілінкевіч*

# Асаблівасці ўжывання юліянскага і грыгарыянскага каляндароў прадстаўнікамі роду Радзівілаў у канцы XVI – сярэдзіне XVII стст.

Пры вывучэнні гісторыі нашых зямель дастаткова часта даследчыкі сутыкаюцца з біяграфіямі шматлікіх прадстаўнікоў роду Радзівілаў. Некалькі стагоддзяў лёс іх сям'і быў звязаны з гісторыяй Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Радзівілы прымалі ўдзел у большасці значных падзей, якія адбываліся ў дзяржаве. Вялікая колькасць дакументаў, якая засталася пасля іх (лісты, дзённікі, гаспадарчыя і ўрадавыя распараджэнні і г. д.), з'яўляецца каштоўнай крыніцай для вывучэння многіх аспектаў гісторыі.

Не стала выключэннем і такая важная падзея, як змена каляндароў у Рэчы Паспалітай у канцы XVI ст. Пісьмовыя крыніцы, якія пакінулі пасля сябе прадстаўнікі роду Радзівілаў, даюць магчымасць прасачыць адначасовае бытаванне двух каляндарных сістэм і асаблівасці іх ужывання. Гэта важна, як для даследчыкаў гісторыі дзяржавы, так і роду Радзівілаў.

Трэба адзначыць, што гісторыя ўжывання юліянскага і грыгарыянскага каляндароў на тэрыторыі сучаснай Беларусі мала даследавана. Між тым каляндарныя сістэмы ў выніку войн, падзелаў, паўстанняў, на нашых землях мяняліся кожнае стагоддзе. Толькі з прыходам да ўлады бальшавікоў каляндарнае пытанне было канчаткова вырашана.

Для лепшага разумення праблемы звернемся да гісторыі і акалічнасцей узнікнення грыгарыянскага каляндара.

Сістэма летазлічэння прыйшла да нас з Егіпта. У 46 г. да н. э. імператар, філосаф і палкаводзец Гай Юлій Цэзар рэфармаваў сонечны каляндар, які быў названы ў яго гонар юліянскім. У той час ён быў наватарскім, але просты і зручны ў сваёй аснове юліянскі механізм адліку меў недакладнасць: працягласць каляндарнага года была на 11 хвілін і 14 секунд большая за астранамічны, таму кожныя 128 гадоў назапашвалася памылка на адны

суткі, якая да сярэдзіны XVI ст. вырасла да дзесяці сутак і прывяла да несупадзення сапраўднага вясновага раўнадзенства (поўні) з каляндарным.

На недакладнасць юліянскага каляндара даўно звярнулі ўвагу заходнееўрапейскія і візантыйскія вучоныя. «Паправіць» яго імкнуліся яшчэ з XIV ст., але гэта стала магчыма толькі ў часы Рэфармацыі, калі навука пачала адыгрываць немалаважную ролю ў жыцці людзей. Вырашэннем каляндарнай праблемы заняўся рымскі папа Грыгорый XIII. Ён у 1578 г. заклікаў да працы лепшых вучоных і некаторыя ўніверсітэты, даручыўшы ім «паправу» існуючай сістэмы адліку часу.

Абмінаючы дэталі каляндарнай рэформы, адзначым яе галоўную сутнасць: ліквідавалася спазненне каляндара на 10 сутак, назапашаныя амаль за 1280 гадоў пасля Нікейскага Сабору (на ім было прынята рашэнне святкаваць дату ўваскрашэння Хрыста ў перыяд паміж 22 сакавіка і 25 красавіка). Гэта дасягалася тым, што з каляндара былі «выкінуты» «лішнія» суткі: пасля чацвярга 4 кастрычніка 1582 г. адразу наступіла пятніца 15 кастрычніка. Новы каляндар пачаў называцца грыгарыянскім, у гонар ініцыятара рэформы Грыгорыя XIII[1].

***Табліца. Прыняцце грыгарыянскага каляндара ў краінах свету***

| *Краіна* | *Калі перайшлі на грыгарыянскі каляндар* |
|---|---|
| Іспанія | 15.10.1582 |
| Італія | 15.10.1582 |
| Рэч Паспалітая | 15.10.1582 |
| Партугалія | 15.10.1582 |
| Францыя | 20.12.1582 |
| Баварыя | 16.10.1583 |
| Аўстрыя | 17.11.1584 |
| Венгрыя | 01.11.1587 |
| Прусія | 02.09.1610 |
| Англія | 14.07.1752 |
| Швецыя | 01.03.1753 |
| Нарвегія | 01.03.1700 |
| Фінляндыя | 01.03.1753 |
| Расія | 14.02.1918 |

[1] Мілінкевіч, І. Грыгарыянскі каляндар на Беларусі // Наука–2009: сб. науч. ст. В 2 ч. – Гродно, 2009. – Ч. 1. С. 68–69.

Увядзенне чагосьці новага, невядомага, разам з аднachасовай ломкай старога, няхай і недасканалага, не магло прайсці бесканфліктна. Пераход на новы каляндар з’яўляўся ініцыятывай каталіцкага касцёла, таму ён адразу набыў заходнехрысціянскую афарбоўку, што зрабіла яго непрыдатным для выкарыстання на пратэстанцкіх і праваслаўных землях. У адказ на папскую булу з’явілася шмат ананімных лістоў і чуткаў аб блізкім «канцы свету». Іх асабліва актыўна распаўсюджвалі пратэстанты, якія лічылі, што: «Лепей разысціся з Сонцам, чым сысціся з папам». Адмоўна паставілася да новаўвядзення і праваслаўная царква, прадстаўнікі якой убачылі ў гэтым падрыў свайго аўтарытэта і спробу падначаліць іх духоўнай уладзе папы. Канстанцкі сабор, скліканы ў 1583 г. патрыярхам Іярэміем II, уважліва абмеркаваў каляндарнае пытанне і абвясціў новы каляндар чарговым эксперыментам Рыма, прызнаў яго некананічным і пагражаў праклёнам тым, хто б асмеліўся святкаваць па-новаму.

Прынящце грыгарыянскага каляндара расцягнулася на гады і нават стагоддзі **(гл. табл.)**. У ліку першых у 1582–1583 гг. на яго перайшлі Іспанія, Партугалія, Францыя і Рэч Паспалітая – краіны, дзе каталіцызм быў пануючай рэлігіяй, або карыстаўся дзяржаўнай падтрымкай.

Граматай Стэфана Баторыя ў 1582 г. грыгарыянскі каляндар уводзіўся на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Прыняты ў каталіцкім асяроддзі, ён сустрэў рэзкі адпор праваслаўнага і пратэстанцкага насельніцтва. Сур’ёзныя «каляндарныя» канфлікты былі зафіксаваны ў Полацку, Вільні, Львове. Гэтыя хваляванні прымусілі ўрад узаконіць права праваслаўных карыстацца старым летазлічэннем і адзначаць свае святы згодна традыцыі. Стэфан Баторы быў вымушаны тлумачыць, што ўвёў новы каляндар не з мэтай уціску праваслаўных, а для «порядку и справ Речи Посполитое…». Такім чынам, поліканфесіянальнасць беларускіх земляў абумовіла ўзнікненне традыцыі выкарыстання двух каляндароў у паўсядзённым жыцці і часткова ў справаводстве[1].

Пераход з юліянскага на грыгарыянскі каляндар прыпаў на перыяд жыцця і дзейнасці аднаго з найбольш вядомых прадстаўнікоў роду

[1] Мілінкевіч, І. Калізіі ўвядзення новага календара Стэфанам Баторыем // Краязнаўчыя запіскі. – Гродна, 2013. – № 9. – С. 107–113.

Радзівілаў – Мікалая Крыштафа Сіроткі (1549–1616). Народжаны ў пратэстанцкай сям'і ён у свядомым узросце перайшоў у каталіцтва, зрабіўся актыўным прыхільнікам і распаўсюджвальнікам заходняга хрысціянства. Будучы адданым каталіком і сябрам папы рымскага ён з лёгкасцю прыняў грыгарыянскі каляндар і з кастрычніка 1582 г. спакойна перайшоў на новае летазлічэнне. Аналіз ліставання князя па асабістых і дзелавых пытаннях паказвае, што Сіротка стабільна выкарыстоўваў грыгарыянскі каляндар, часам указваючы каталіцкія святы.

Згадкі пра каляндарную рэформу сустракаем у «Пэрэгрынацыі…» – апісанні падарожжа Мікалая Крыштафа ў Святую Зямлю. Так, распавядаючы пра пачатак пілірымкі князь Радзівіл пісаў:

*«Атрымаўшы ў караля дазвол, вярнуўся я ў Нясвіж, дзе было ўжо ўсе гатова, і, Найсвяцейшыя таемствы прыняўшы, у імя Гасподняе 19 дня верасня года Гасподняга 1582 выправіўся ў дарогу; а як на той самы год направа календара прыпала, то ў лістападзе быў я ўжо на мяжы італійскай і крыху забавіўся, спраўляючы набажэнства ў некаторых мясцінах Ламбардыі, пасля ж, восьмага дня снежня ў самое свята пачацця Найсвяцейшае Дзевы (колькі дзён перад тым выслаўшы чэлядзь у Верону), прыехаў у Венецыю…»*[1].

У той жа «Пэрэгрынацыі…» Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка пры неабходнасці звяртаўся і да юліянскага каляндара. Напрыклад:

*«У Іерусаліме каля Гроба Гасподняга. Восьмага дня ліпеня выйшлі мы з царквы, а быў дзень Святых Апосталаў Пятра і Паўла паводле старога календара, калі бачылі мы праз ноч цэлую, як розныя народы ў сваіх месцах абрады і набажэнства свае спраўлялі»*[2].

Няўважлівасць сучасных аўтараў да каляндарнага пытання часам прыводзіць да памылак у датаванні падзей. Такую памылку дапусціў Томаш Кэмпа, даследчык жыцця і дзейнасці М. К. Радзівіла Сіроткі, у сваім артыкуле «Мікалай Радзівіл Сіротка і Берасцейская унія». Ён піша, што

[1] Перэгрынацыя, або Паломніцтва Ясна Асветленага Ягомосці Мікалая Крыштафа Радзівіла ў Святую Зямлю / пер. С. Шупы // Кніга жыцій і хаджэнняў / Уклад., прадм. і каментарыі А. Мельнікава. – Мінск, 1994. – С. 173–174.

[2] Тамсама. С. 274.

*«…Сіротка прыбыў на сабор першым з дэлегатаў караля ў сераду 6 кастрычніка»*[1].

У гэтым жа артыкуле аўтар цытуе ліст М. К. Радзівіла з Нясвіжа да К. Радзівіла, датаваны 5 кастрычніка 1596 г., у якім той пісаў:

*«Што да майго ад'езду на Падляшша, то ўжо даўно б туды паехаў, але раптоўная хвароба маёй жонкі (якая ўжо каторы раз яе трывожыць…) затрымала мяне да гэтага часу, каб толькі з ласкі Божае хоць трохі ёй палепшыла, тады ужо на падводах туды і паспяшаюся»*[2].

У XVI ст. не было магчымасці за адзін дзень дабрацца з Нясвіжа да Берасця. Тлумачэнне гэтай блытаніны у тым, што Томаш Кэмпа, гаворачы пра Берасцейскі сабор, абапіраецца на звесткі Баркулабаўскага летапісу, аўтар якога, праваслаўны манах Нічыпар, непрыхільна ставячыся да новага календара і уніі, датаваў падзеі па звыкламу для яго юліянскаму каляндару[3]. Гэта лёгка пацвердзіць з дапамогай спецыяльных табліц, ведаючы дзень тыдня і дакладную дату. У 1596 г. 6 кастрычніка прыпадала на сераду ў тым выпадку, калі летазлічэнне вялося па юліянскаму каляндару. Паводле грыгарыянскага каляндара Берасцейскі сабор адбываўся 16–20 кастрычніка 1596 г., сама царкоўная унія была абвешчана 18 кастрычніка. Такім чынам можна ўпэўнена сцвярджаць, што Сіротка прыбыў на сабор у дзень яго пачатку, 16 кастрычніка 1596 г. Гэты выпадак паказывае, што пры вывучэнні крыніц па гісторыі роду Радзівілаў належыць улічваць не толькі агульнапрыняты стыль летазлічэння, але і погляды аўтара крыніцы, які асвятляе падзеі.

Па прыкладу Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі Радзівілы нясвіжскай лініі вярнуліся ў лона каталіцкага касцёла і разам з тым прынялі новы каляндар. Большую цікавасць выклікае біржанская, пратэстанцкая, лінія роду. Ужо адзначалася, што прыхільнікі рэфармацыі неадназначна паставіліся да грыгарыянскага календара. Напрыклад, яшчэ ў 1583 г. пратэстанцкі прафесар Лука Асіяндэр (1571–1638) назваў рэформу бязбожнай, а папу – антыхрыстам, які пажадаў загадваць зоркамі. У той

[1] Кэмпа, Т. Мікалай Крыштафор Радзівіл Сіротка і Берасцейская ўнія // Arche-пачатак. – 2015. – № 6. Князі Радзівілы. – С. 86.

[2] Тамсама. С. 85.

[3] Мілінкевіч, І. Грыгарыянскі каляндар на Беларусі…

жа час выдатны вучоны Іаган Кеплер (1571–1630), хоць і быў пратэстантам, выступіў за рэформу календара, разумеючы яе неабходнасць[1].

Пераход на грыгарыянскі каляндар у пратэстанцкіх краінах расцягнуўся на стагоддзі. Асабліва ўпарціліся англічане і шведы: яны, як вядома, пратрымаліся аж да XVIII ст.

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ) знаходзіцца некалькі дзясяткаў лістоў князеў Радзівілаў біржанскай лініі, прысвечаных службовым, ваенным і асабістым пытанням. Сярод іх захоўваюцца і лісты Януша Радзівіла (1579–1620), падчашага ВКЛ у 1599–1619 гг., кашталяна віленскага з 1618 г., старасты барысаўскага, актыўнага прыхільніка пратэстантызму[2]. Князь атрымаў кальвінісцкае выхаванне, вучыўся ў Страсбургскім і Базэльскім універсітэтах, падарожнічаў па Германіі, Чэхіі, Аўстрыі, Венгрыі, Францыі. Выбіраўся паслом на соймы 1603, 1605, 1606 гг., дзе ўзначальваў кальвінісцкую і праваслаўную групоўкі, адстойваў рэлігійныя і палітычныя правы некатолікаў. Пры вывучэнні большасці лістоў дастаткова цяжка акрэсліць, якім каляндаром карыстаўся Януш Радзівіл. Не пазначаюцца святы (як, напрыклад, у ліставанні М. К. Радзівіла Сіроткі), скупа ўказваюцца толькі месяц, дзень і год. Аднак у карэспандэнцыі адрасаванай князю, сустракаюцца лісты з паметкамі «старога календажа» ці наадварот. Напрыклад, ліст

*«…да Януша Радзівіла ад старасты Лазара Соленовіча па справе інтэрэсаў у судзе Забалоцье… Дела тое месяца мая двадцаць чацвертага для року тысяча шестісотага каляндара новога»*[3].

Будучы на дзяржаўнай пасадзе, стараста выкарыстоўваў афіцыйна прыняты каляндар Рэчы Паспалітай, што ўдакладніў у лісце да князя-пратэстанта.

Сын Януша Радзівіла – Багуслаў (1620–1669) быў апошнім мужчынскім прадстаўніком біржанскай кальвінскай лініі Радзівілаў. Ажыццяўляў нефармальную функцыю галоўнага апякуна пратэстантаў ВКЛ. На соймах ён абараняў іх правы, выступаючы супраць канстытуцыі аб выгнанні

[1] Мілінкевіч, І. Калізіі ўвядзення новага календара…

[2] Грыцкевіч, А. Радзівіл Януш // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя. – Мінск : «Беларуская энцыклапедыя», 2005. – Т. 2. – С. 500.

[3] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) – ф. 694. – воп. 3. – спр. 8.

арыян з Рэчы Паспалітай. У сваіх уладаннях князь Радзівіл падтрымліваў і фундаваў пратэстанцкія зборы, таксама апекаваўся і праваслаўнымі цэрквамі[1]. Вядома, што ён пісаў у сярэднім па 15 лістоў кожны дзень (за рэдкім выключэннем) сябрам, дзелавым партнёрам, прадстаўнікам манаршых двароў шэрагу еўрапейскіх краін. Лісты, якія знаходзяцца ў НГАБ, датаваны толькі годам іх напісання[2]. Аднак захаваўся дзённік князя, з якога выразна відаць, што ў паўсядзённым жыцці ён карыстаўся «папскім» каляндаром.

Напрыклад:

*«У чацвер рана, каля восьмай, 29 чэрвеня 1651 г., арда, непараўнальна мацнейшая, чым напярэдадні падышла да Козіна»*[3].

Паколькі вядомы дзень тыдня і дата, з дапамогай спецыяльных табліц мы вызначылі, што датаванне вядзецца паводле грыгарыянскага каляндара. Відавочна, князь, які атрымаў выдатную еўрапейскую адукацыю, карыстаўся тым каляндаром, які да сярэдзіны XVII ст. быў прыняты ў большасці еўрапейскіх краін.

Яшчэ адным знакамітым пратэстантам з біржанскай лініі з'яўляецца стрыечны брат Багуслава Януш Радзівіл (1612–1655), дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ. Ён вучыўся ў кальвінскай Слуцкай гімназіі, Лейпцыгскім, Альтдорфскім і Лейдэнскім універсітэтах, наведваў Францыю і Англію. Узяўшы шлюб з каталічкай Кацярынай Патоцкай, зблізіўся з католікамі, а пасля яе смерці і заключэння новага шлюбу з дачкой малдаўскага правіцеля Марыяй Лупу ўзмацніў сувязі з праваслаўнымі Вялікага Княства. Разам з тым ён адкрываў кальвінісцкія зборы і школы, фінансаваў пратэстанцкія абшчыны, студэнтаў, якія вучыліся ў еўрапейскіх універсітэтах[4].

Пры аналізе лістоў Януша Радзівіла, якія захоўваюцца ў НГАБ, бачна, што ў большасці выпадкаў яны датаваны толькі днём і годам,

---

[1] Грыцкевіч, А. Радзівіл Багуслаў // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 487.

[2] НГАБ – ф. 694. – воп. 3. – спр. 14.

[3] Багуслаў Радзівіл. Аўтабіяграфія. / пер. з пол. мовы А. Бутэвіч, Ул. Сіўчыкаў. – Мінск, Радыёла-плюс, 2009. – С. 41.

[4] Грыцкевіч, А. Радзівіл Януш // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя. – Т. 2. – С. 501.

без удакладнення каляндара, але ёсць і выключэнні. Напрыклад, ліст з Крулеўца, напісаны

*«…уласнай рукой Януша князя на Біржах і Дубінках, гетмана польнага да пана Пітэра Міхлова і яго жонкі Барбары Элертэ з Мехелена»* пазначаны *«вэдлуг новэго календажа»*[1].

Паколькі ў лісце ідзе гаворка пра выплату «тысячы польскіх злотых» у вызначаны тэрмін, то і ўдакладнялася дата

*«…у дзень Божага Нараджэння рымскага свята паводле новага каляндара».*

Відавочна, калі была неабходнасць, князь адзначаў, якім каляндаром неабходна кіравацца, каб пазбегнуць памылак.

Як бачна, у канцы XVI – сярэдзіне XVII стст. Радзівілы, як каталікі, так і пратэстанты, аддавалі перавагу выкарыстанню новага (грыгарыянскага) каляндара. Гэта абумоўлена іх глыбокай інтэграванасцю ў найвышэйшае кола еўрапейскай арыстакратыі і палітычнае жыццё дзяржавы. Яны актыўна падарожнічалі па Еўропе, слухалі лекцыі ў буйнейшых універсітэтах, былі знаёмыя з некаторымі манархамі, чым і абумоўлена іх прыхільнасць да новага каляндара. Займаючы вышэйшыя дзяржаўныя пасады ў Рэчы Паспалітай, яны былі абавязаны карыстацца тым летазлічэннем, якое было афіцыйна прынята ў гэтай дзяржаве. Хаця з кожнага правіла можа быць выключэнне. Вывучаючы дакументальную спадчыну Радзівілаў, важна звяртаць увагу на «каляндарныя пытанні». Іх ігнараванне даследчыкамі прыводзіць да блытаніны ў датаванні падзей, і гэтыя памылкі ідуць далей у навуковае абарачэнне.

---

[1] НГАБ – ф. 694. – воп. 3. – спр. 5. – арк. 151–152.